**Заключэнне.** Вывучэнне і аналіз навуковай і палітычнай дзейнасці прадстаўнікоў заходнерусізму на рубяжы XIX–XX стагоддзяў, калі ішоў бурны працэс станаўлення нацый, а ва ўмовах вострых міжнародных супярэчнасцей рушыліся імперыі, фарміраваліся маладыя нацыянальныя дзяржаўныя ўтварэнні, паказвае эвалюцыю поглядаў, ад прызнання гісторыка-культурнай адметнасці Беларусі да мажлівасці яе нацыянальна-культурнага самавызначэння. Іх выхаванцы пайшлі яшчэ далей, уключыліся ў барацьбу за дзяржаўнае самавызначэнне Беларусі. Таму можна высока ацэньваць уклад гуманітарнай інтэлігенцыі г. Віцебска ў станаўленне беларускай нацыі.

Спіс літаратуры

1. Цьвікевіч А. «Западно-руссизм»: Нарысы з гісторыі грамадскай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.
2. Стукалич В.К. Краткая заметка о белорусском наречии / В.К. Стукалич. – Витебск, 1895. – 21 с.
3. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. – Ф. 115. – Воп. 1. – Спр. 59.
4. Сапунов А.П. Речи в Государственной Думе III-го созыва. СПб., 1912. 48 с.
5. Сапунов А.П. Белоруссия и белорусы / А.П. Сапунов – Витебск, 1910. – 21 с.
6. Архіў УКДБ па Віцебскай вобласці. – Справа Стукаліча У.К.
7. Архіў УКДБ па Віцебскай вобласці. – Спр. 106.
8. Архіў УКДБ па Віцебскай вобласці. – Спр. 20951-с. – Т. 17.

## ПРАВЯДЗЕННЕ “ТЫДНЯ ДАПАМОГІ ГАЛАДАЮЧЫМ” НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ Ў 1921 Г.

*Г.Х. Базарэвіч*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Узаемадзеянне грамадства і дзяржавы з’яўляецца вырашальным фактарам у паспяховай барацьбе з сацыяльнымі праблемамі. З 1921 г. у Савецкай дзяржаве востра стаяла праблема голаду, які ахапіў насельніцтва тэрыторый Паволжа, раёнаў Башкірыі, Урала, Заходняй Сібіры, Казахстана, часткі Паўднёвай Украіны, цалкам больш за 30 губерній [5, с. 14]. Бездагляднасць дзяцей, бежанства, беспрацоўе і вялікі рост смяротнасці сталі наступствамі бедства. У дзяржаўнай праграме Савецкай улады па ліквідацыі голаду ў Паволжы значнае месца адводзілася сацыяльным кампаніям, а менавіта “тыдням дапамогі галадаючым”, якія з’яўляліся спецыфічнай формай супрацы грамадства і дзяржавы ў аказанні дапамогі пацярпелым.

Мэта працы: прасачыць ход і рэалізацыю кампаніі “тыдня дапамогі галадаючым” на тэрыторыі Віцебскай губерні у 1921 г.

**Матэрыял і метады.** Для даследавання былі выкарыстаны матэрыялы Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, фонд Віцебскай губернскай камісіі па барацьбе з наступствамі голаду, а таксама заканадаўчыя акты Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту. Падчас працы былі выкарыстаны агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады: гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Да сакавіка 1924 г. Віцебская губерня знаходзілася ў складзе РСФСР, таму рэалізацыя дзяржаўнай праграмы па барацьбе з голадам у Паволжы на дадзенай тэрыторыі выконвалася адпаведна з заканадаўчымі актамі Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савета Народных Камісараў. Адной з найбольш маштабных і кантралюемых кампаній стаў “Усерасійскі тыдзень дапамогі галадаючым”. Дэкрэтам УЦВК ад 3 верасня 1921 г. у перыяд з 15.10.1921 г. па 15.11.1921 г. быў абвешчаны “Усерасійскі тыдзень дапамогі галадаючым” [4]. На пасядджэнні Віцебскай губернскай камісіі дапамогі галадаючым кампанію вырашана было распачаць з 1 лістапада 1921 г. [1, арк.68].

Мэтай правядзення “тыдня дапамогі галадаючым” з’яўлялася прыцягненне ўсіх савецкіх і прафесійных органаў, шырокіх мас працоўных і сялянства да аказання дапамогі пацярпелым ад голаду ў Паволжы [4]. Праца была накіраваная на збор ахвяраванняў у выглядзе грошай, рэчаў і харчавання.

Падрыхтоўчы этап “тыдня дапамогі галадаючым” заключаўся ў стварэнні “троек” – каардынуючых органаў. Адпаведна з пастановай арганізацыйна-адміністрацыйнае кіраўніцтва і кантроль за правядзеннем кампаніі ў губернях ажыццяўлялі губернскія “тройкі”, куды ўваходзілі старшыня, сакратар і члены. Такія ж “тройкі” ствараліся на ўзроўні ўездаў і валасцей [2, арк. 38].

Репозиторий ВГУ

Ва ўмовах гораду, апроч прыёму добраахвотных ахвяраванняў, рэалізацыя кампаніі была накіраваная і на абавязковы збор адлічэнняў з прафсаюзных арганізацый і дадатковых працоўных гадзін, правядзенне суботнікаў. Ладзіліся скарбоначныя зборы падчас мітынгаў, правядзенне якіх ускладалася на вайсковыя часткі, культурна-масавыя мерапрыемствы, сабраныя сродкі і даходы ад якіх накіроўваліся на рахунак Віцебскага губернскага камітэту дапамогі галадаючым Паволжа. Губернскі камунальны аддзел распрацаваў адмысловую праграму адлічэнняў з паслуг: праезду трамваем, лодачных пераправ, паслуг цырульні і кляймення гір і вагаў [2, арк. 20]. Пасільны ўдзел у кампаніі прымалі дзеці: неаднаразова ў Віцебску ладзіліся спектаклі, даход ад якіх цалкам прызначаўся на паляпшэнне стану галадаючых. Школьныя камісіі сістэматычна давалі звесткі аб пералічэннях грашовых ахвяраванняў, якія былі сабраныя вучнямі [1, арк. 47]. За тэрмін правядзення кампаніі сума грашовых збораў і ахвяраванняў па Віцебску склала 66 831 449 рублёў [2, арк. 68].

Сродкі, якія паступалі на рахунак і ў прыёмнікі ахвяраванняў Віцебскага губернскага камітэту дапамогі галадаючым Паволжа, накіроўваліся не толькі ў галадаючыя губерні, але і выкарыстоўваліся для абслугоўвання бежанцаў, што апынуліся на тэрыторыі Віцебскай губерні і мелі патрэбу ў забеспячэнні неабходнымі рэчамі і харчаваннем. Наплыў бежанцаў ставіў новыя абавязкі перад Віцебскім губернскім камітэтам дапамогі галадаючым – гэта размеркаванне і ўтрыманне дзяцей-сірот і хворых. Падчас правядзення “тыдня дапамогі галадаючым” у Аршанскім уездзе для ўтрымання дзяцей, якія прыбылі з тэрыторый ахопленых голадам, былі падрыхтаваны ўмовы, якія дазвалялі размясціць яшчэ 346 дзяцей і адчыніць дзіцячы дом [2, арк. 71].

Ва ўездах Віцебскай губерні ствараліся агітацыйныя і гаспадарчыя камісіі. Відавочна, што вялікія спадзяванні на эфектыўнасць правядзення кампаніі накладаліся на працу агітацыйнай камісіі, такім чынам, прапаганда мела ключавую ролю ў падрыхтоўчым этапе кампаніі. Яшчэ да афіцыйнага пачатку “тыдня дапамогі галадаючым” агітатары накіроўваліся ў воласці і ладзілі выступы на тэму голаду, на працягу кампаніі праводзілі мітынгі, сходы, канцэрты. Такія метады былі абумоўлены неабходнасцю стварэння ў сялянскіх масах памкнення і гатоўнасці да сістэматычнай і сталай дапамогі галадаючым. Напрыклад, за тыдзень з 1 па 8 лістапада 1921 г. па Лепельскаму ўезду было праведзена 30 мітынгаў, па Аршанскаму 20 сходаў і 3 спектаклі [2, арк. 71]. Аднак, зыходзячы з рэкамендацый для працы агітатараў, выступы прымалі не толькі сацыяльны характар, але і палітычны. Раскрываючы прычыны голаду агітатары падкрэслівалі згубны ўплыў самадзяржаўнага строю на гаспадарку і разбуральныя наступствы грамадзянскай вайны [2, арк. 30]. Такія захады тлумачацца жаданнем маладой Савецкай улады выклікаць прыязныя адносіны з боку грамадства, што з’яўлялася неабходнасцю для паспяховага супрацоўніцтва ў барацьбе з голадам.

Цэнтральны камітэт дапамогі галадаючым пры УЦВК на чале са старшынёй М.І. Калініным, рэкамендаваў звярнуць асаблівую ўвагу на правядзенне “тыдня дапамогі галадаючым” у вёсцы [1, арк. 67]. Закладам поспеху кампаніі было недапушчэнне пропуску ніводнай сялянскай гаспадаркі. Нягледзячы на дабравольны характар ахвяраванняў, усталёўвалася абавязковае правіла: адна гаспадарка павінна здаць не менш за 5 пудоў прадуктаў [2, арк. 38].

Зыходзячы са зместу рэкамендацый для валасных каардынуючых “троек”, можна зрабіць выснову, што асноўныя спадзяванні на эфектыўнасць правядзення кампаніі ў вёсцы ўскладаліся на ўдзел заможнага сялянства. Да адпраўкі зборшчыкаў валасная “тройка” складала спіс усіх заможных гаспадарак, арцеляў, саўгасаў і калгасаў, якім належыла самастойна дастаўляць ахвяраванні непасрэдна ў валасць. “Указанную меру стоит провести обдуманно-настойчиво, чтобы не дать зажиточным хозяйствам отделаться во время сбора пожертвований пустяками, однако, сбор этот должен быть исключительно добровольным” [2, арк. 38]. Дадзены намер ажыццявіўся, пра што сведчаць зводкі па ўездах. Напрыклад, па Лепельскаму ўезду асобна прыведзены прозвішчы здатчыкаў: Паплаўскі, Дыкман, гаспадар млына Самуіл Іткін, Пайкін. Вядома, што Самуіл Іткін быў гаспадаром млына ў Лепелі [3, с. 389].

Прадастаўленне звестак аб ходзе правядзення і выніках “тыдня дапамогі галадаючым” па валасцях і ўездах у Віцебскую губернскую камісію дапамогі галадаючым Паволжа стала заключным этапам кампаніі.

**Заключэнне.** Такім чынам, кампанія па правядзенні “тыдня дапамогі галадаючым” ў Віцебскай губерні ў 1921 г. мела падрыхтоўчы этап, які быў прысвечаны арганізацыі



Репозиторий ВГУ

каардынуючых органаў – “троек” у адміністрацыйных цэнтрах. Рэалізацыя кампаніі пачыналася з агітацыйнай і прапагандысцкай працы для стварэння спрыяльных настрояў у працоўных і сялянскіх масах. Збор ахвяраванняў праводзіўся сярод прафесійных калектываў і прадпрыемстваў праз прафсаюзныя органы, у сельскай мясцовасці сярод гаспадарак пасродкам зборшчыкаў. Рэалізацыя кампаніі ў сельскай мясцовасці характарызуецца дыферэнцыраваным падыходам, пра што сведчыць кропкавы зварот да буйных гаспадарак і заможных сялян. У адначассе працавалі пункты прыёму ахвяраванняў, ўзмацнялася праца ў правядзенні дабрачынных мерапрыемстваў, скарбоначных збораў. Не спынялася праца па ўтрыманні дзяцей Паволжа, арганізацыі сталовак і харчовых пуктаў для бежанцаў.

Спісак літаратуры
1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 570. Воп.1. Спр. 8.
2. ДАВВ. – Ф. 570. Воп.1. Спр. 33.
3. Лепель: память о еврейском местечке / Центр научных работников и преподавателей иудаики в вузах “Сэфер”; отв. ред. С. Амосова – М., 2015. – 496 с.
4. Об объявлении «всероссийской недели помощи голодающим»: Декрет Всероссийского Центрального Исполнительного Комитета, 2 февр. 1921 г. // Собрание узаконений и распоряжений правительства за 1921 г. – 1944 г. – С. 752.
5. Поляков, Ю.А. 1921-й: победа над голодом / Ю.А. Поляков. – М.: Политиздат, 1975. – 112 с.

## РАБОТА ОБЩЕСТВА КРАСНОГО КРЕСТА БССР В СРЕДНИХ СПЕЦИАЛЬНЫХ И ВЫСШИХ УЧЕБНЫХ ЗАВЕДЕНИЯХ В 1970–1990-Е ГГ.

*Ю.Н. Бахир*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

На сегодняшний день развитие общественной инициативы и поддержки населения приобретает большую актуальность. Несмотря на существование достаточно большого количества объединений, которые оказывают помощь людям, темпы и качество развития их структуры, направлений развиваются медленно. В связи с этим возможно обратиться к историческому опыту деятельности одной из самых массовых общественных организаций БССР – Общества Красного Креста (ОКК). Общество активно работало с различными категориям населения, также проводило мероприятия оздоровительного, профилактического характера со школьниками и среди студентов. Грамотный подход к работе с подрастающим поколением формирует положительное отношение к здоровому образу жизни, умение оказать первую помощь, уменьшает риск заболеваемости.

Цель статьи – рассмотреть основные направления работы ОКК БССР в средних специальных и высших учебных заведениях в 1970-е–1990-е гг.

**Материал и методы**. Источниками для написания работы послужили материалы фондов Национального архива Республики Беларусь, государственных архивов Гродненской, Брестской и Минской областей. В процессе изучения вопроса были использованы методы анализа и синтеза, сравнения и обобщения, которые помогли определить основные направления деятельности, выявить общие и особенные тенденции в работе КК на разных этапах развития.

**Результаты и их обсуждение.** По состоянию на 1970 г. в республике было 28 высших и 126 средних специальных учебных заведений. Во всех ВУЗах и техникумах действовали первичные организации – 146694 члена общества или 82% от числа студентов и преподавателей. В Гомеле процент был выше среднего показателя – 87,6%, в Витебске – 83,4%. Относительно низкий процент охвата наблюдался в Минской области– 61,2%. Число членов общества по сравнению с 1969 г. увеличилась на 19.714. [1, л. 65]. Во многих первичных организациях все студенты являлись членами Общества. Для активизации работы в учебные заведения направлялись памятки, изданные Исполкомом СОКК и КП СССР. Например, студентам 3 и 5 курсов медвузов, уезжавшим ежегодно на летнюю производственную практику, давалось задание-памятка КК, изданная Министерством здравоохранения и ЦК ОКК БССР. О произведенной работе по заданию каждый студент отчитывался письменно перед кафедрой организации здравоохранения. Медработники и комитеты готовили санпосты из студентов, которые выезжали на республиканские и союзные стройки, оснащали их аптечками, необходимым запасом медикаментов и санитарно-просветительской литературой.

Активистами КК систематически оказывалась помощь местным органам здравоохранения в проведении подворных обходов на предмет выявления грибковых заболеваний, педикулеза.

Репозиторий ВГУ